УДК 94(37)

**С. М. Смірноў**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, вул. Мендзялеева, 36, 220037 Мінск,
Рэспубліка Беларусь, +375 (44) 599 43 35, viales89@gmail.com

# РЭЛІГІЙНАЯ ПАЛІТЫКА АЛЯКСАНДРА СЕВЕРА: ТРАДЫЦЫЯ І СІНКРЭТЫЗМ

Дадзены артыкул прысвечаны аналізу асноўных асаблівасцей рэлігійнай палітыкі рымскага імператара Аляксандра Севера на аснове звестак рымскіх гісторыкаў, эпіграфікі і нумізматыкі. Разглядаюцца праявы рэлігійнага традыцыяналізму і сінкрэтызму ў палітычнай і рэлігійнай прапагандзе Аляксандра Севера. Актуальнасць дадзенага даследавання заключаецца ў высвятленні гістарычнай карціны развіцця духоўнай культуры рымскай цывілізацыі, якая дагэтуль з’яўляецца асновай культуры сучаснага свету. Рэлігійная палітыка Аляксандра Севера адначасова падтрымлівала традыцыі рымскай рэлігіі і цярпіма ставілася да сінкрэтычных тэндэнцый у рэлігійным жыцці насельніцтва Рымскай імперыі.

**Ключавыя словы:** рэлігійная палітыка; сінкрэтызм; традыцыяналізм; рымская рэлігія; Рымская імперыя.
Бібліягр.: 23 назвы.

**S. M. Smirnou**
Belarussian State University, 36 Mendeleeva Str., 220037 Minsk, the Republic of Belarus,
+ 375 (44) 599 43 35, viales89@gmail.com

# RELIGIOUS POLITICS OF ALEXANDER SEVERUS: TRADITION AND SYNCRETISM

This article is devoted to the analysis of the main features of the religious policy of Alexander Severus and is based on the evidence of Roman historians, numismatics and epigraphy. The article deals with the manifestations of syncretism and traditionalism in the political and religious propaganda of Alexander Severus. The relevance of this research is in clarifying the historical picture of the development of the spiritual culture of the Roman civilization, which is the basis of modern culture. The religious policy of Alexander Severus simultaneously supported the traditions of the Roman religion and was tolerant to syncretic tendencies in the religious life of the population of the Roman Empire.

**Key words:** religious politics; syncretism; traditionalism; roman religion; the Roman Empire.
Ref.: 23 titles.

**Уводзіны.** У гістарыяграфіі рэлігійная палітыка рымскага імператара Аляксандра Севера вызначаецца як рэакцыя на рэлігійныя мерапрыемствы імператара Элагабала. Гісторыкі падкрэсліваюць, што асноўнай асаблівасцю рэлігійнай палітыкі Аляксандра Севера была падтрымка традыцыйнай рымскай рэлігіі [1, с. 384—385; 2, с. 93—94]. На думку А. М. Штаерман, Аляксандр Север імкнуўся падтрымаць культ найлепшых рымскіх імператараў, што адпавядала ідэалагічным сімпатыям рымскай палітычнай эліты [2, с. 93]. Сярод заходніх даследчыкаў пануе думка, што перыяд кіравання Аляксандра Севера з’яўляўся эпохай рэлігійнай цярпімасці і сінкрэтызму [3, с. 448—449, 451—470].

Аналіз рэлігійнай палітыкі Аляксандра Севера ўскладняецца праблемай аўтэнтычнасці слоў з біяграфіі імператара ў Гісторыі Аўгустаў (Scriptores Historiae Augustae, або SHA) пра яго асабісты ларарый. Аўтэнтычнасць дадзеных звестак адмаўляе нямецкі даследчык Ё. Штраўб, які лічыць зборнік біяграфій рымскіх імператараў палемічным творам эпохі імператара Феадосія. Гэты твор, на думку Ё. Штраўба, прадстаўляе язычніцкі погляд на гісторыю Старажытнага Рыму [4]. На думку польскага гісторыка Р. Сускага, біяграфія Аляксандра Севера з’яўляецца самай недакладнай біяграфіяй з Гісторыі Аўгустаў. Р. Сускі прызнае рэлігійную цярпімасць у палітыцы апошняга прадстаўніка дынастыі Севераў, але ставіць пад сумнеў звесткі Гісторыі Аўгустаў аб асабістым ларарыі рымскага імператара. Асноўная лінія рэлігійнай палітыкі Аляксандра Севера заключалася ў шырокай падтрымцы традыцый рымскай рэлігіі [5, с. 272—289].

© Смірноў С. М., 2022

**Матэрыялы і метады даследавання.** Дадзеная праца прысвечана аналізу рэлігійнай палітыкі Аляксандра Севера на аснове звестак рымскіх гісторыкаў, нумізматычнага і эпіграфічнага матэрыялу. Пры аналізе дадзеных звестак можна выявіць асноўную мадэль узаемадзеяння рэлігійнага традыцыяналізму і сінкрэтызму ў рэлігійнай палітыцы рымскага імператара.

Рэлігійны сінкрэтызм у дадзенай працы разглядаецца як працэс і вынік узаемадзеяння розных рэлігійных традыцый на прасторах Рымскай імперыі [6, с. 83—96]. Значную ролю ў духоўным жыцці імперыі займала рымская рэлігійная традыцыя. На думку Дж. Шайда, рымская рэлігія была адкрытай да ўплыву вераванняў іншых народаў Рымскай імперыі, але захоўвала сваю тоеснасць і валодала гнуткім рытуальным стандартам [7, с. 32—33].

**Вынікі даследавання і іх абмеркаванне.** Сведчанні рымскіх гісторыкаў паказваюць, што рэлігійная палітыка Аляксандра Севера істотна адрознівалася ад палітыкі імператара Элагабала. Новы імператар і яго родзічы імкнуліся ліквідаваць негатыўныя наступствы рэлігійнай рэформы папярэдняга імператара (Dio Cass. LXXX, 1—3; SHA Alex. Sev. XV. 1) [8, с. 363—364; 9, с. 162]. Аляксандр Север адправіў назад свяшчэнны камень салярнага бога ў сірыйскую Эмесу, вярнуў статуі рымскіх багоў, якія былі ў храме салярнага бога, на свае былыя месцы (Dio Cass. LXXIX, 21. 3; Herodian VI, 1. 1—3) [8, с. 363; 10, с. 213]. На падставе дадзеных звестак можна казаць аб палітыцы рэлігійнай рэстаўрацыі, якую праводзіў Аляксандр Север [11]. Імператар аднаўляў прэстыж традыцыі рымскай рэлігіі, супрацьпастаўляў сябе папярэдняму імператару, які здзейсніў радыкальную рэформу рымскай рэлігіі. Рэформа імператара Элагабала заключалася ва ўзвышэнні ролі эмескага бога, які станавіўся новым вярхоўным богам Рымскай імперыі. Гэтая рэформа атрымала негатыўную ацэнку з боку рымскіх гісторыкаў, якія прадстаўлялі пазіцыю рымскай палітычнай эліты.

Палітыка рэлігійнай рэстаўрацыі Аляксандра Севера пацвярджаецца звесткамі нумізматычнага матэрыялу. Выявы свяшчэннага каменя эмескага салярнага бога знікаюць з рымскіх манет. На манетах Аляксандра Севера прысутнічаюць выявы традыцыйных рымскіх багоў. Рымскі імператар надаваў значную ўвагу шанаванню вярхоўнага бога рымскага пантэону Юпітэру Капіталійскаму, які згубіў статус вярхоўнага бога падчас правядзення рэлігійнай рэформы Элагабала. Рымскі Юпітэр атрымлівае на манетах Аляксандра Севера традыцыйныя найменні: Conservator Aug., Propugnator, Ultor, Stator (RIC IV. II. Severus Alexander № 4, 18, 34, 140, 142, 201, 202) [12]. Выявы вярхоўнага бога Старажытнага Рыму сведчаць, што Юпітэр выступаў як асабісты апякун імператара і ўсёй імперыі. Звяртаюць увагу манеты з легендай Iovi Ultor (RIC IV. II. Severus Alexander № 203, 560, 561) [12; 13, с. 7—8]. Эпітэт Ultor (Помснік) з'яўляецца незвычайным для Юпітэра, бо на чаканцы рымскіх імператараў з такім эпітэтам часцей выступаў рымскі бог вайны Марс [11]. На медальёне Аляксандра Севера прысутнічае выява храма ў гонар Iovi Ultor, які падобны на храм эмескага салярнага бога на манетах імператара Элагабала [11; 12, с. 8]. Сярод еўрапейскіх даследчыкаў існуе меркаванне, што Аляксандр Север пасвяціў храм Элагабала ў храм Iovi Ultor, каб прадэманстраваць сваю прыхільнасць традыцыям рымскай рэлігіі [14]. Такім крокам рымскі імператар імкнуўся заручыцца падтрымкай рымскай палітычнай эліты, а таксама рашуча парваць з рэлігійнай рэформай Элагабала. Новы эпітэт Юпітэра сведчыць, што Аляксандр помсціць свайму папярэдніку за парушэнне рэлігійных традыцый Рыма [11; 14]. Рэлігійная рэформа і асоба імператара Элагабала падвяргаліся damnatio memoriae (праклён памяці). Хаця культ эмескага бога не быў забароненым, але губляў сваё афіцыйнае месца, якое атрымаў падчас рэлігійнай рэформы папярэдняга імператара [7, с. 104—105].

Аляксандр Север у сваёй палітычнай і рэлігійнай прапагандзе падкрэсліваў значную ролю рымскага бога Марса ў жыцці імперыі. На манетах гэтага імператара Марс выступае з эпітэтамі «Помснік» (Ultor), «Пераможца» (Victor), «Абаронца» (Propugnator), «Носьбіт Міру» (Pacifero) (RIC IV. II. Severus Alexander № 6, 21, 157—162, 207) [18]. Выкарыстанне Марса ў прапагандзе Аляксандра Севера сведчыць аб пошуках паразумення з вайсковай элітай Рымскай імперыі. Рымскі бог Марс выступае як абаронца дабрабыту і мірнага жыцця на манетах рымска-

га імператара. Імператар спадзяваўся на падтрымку Марса, калі ў 231 годзе н. э. адпраўляўся ў паход супраць дзяржавы Сасанідаў. Знешнія пагрозы імперыі штурхалі выкарыстоўваць вобраз Марса ў чаканцы, каб прадэманстраваць насельніцтву абараназдольнасць Рымскай імперыі.

Аляксандр Север выкарыстоўваў у сваёй рэлігійнай палітыцы рымскую багіню Венеру. На манетах багіня атрымлівае эпітэты Victrix (Параможца) і Caelestis (Нябесная) (RIC IV. II. Severus Alexander № 308, 309). Апошні эпітэт рымскай багіні можа набліжаць яе да пунічнай багіні Таніт, або Ураніі, культ якой быў далучаны да рэлігійнай рэформы імператара Элагабала [15]. Культ сінкрэтычнай багіні не пацярпеў ад рэлігійнай рэстаўрацыі Аляксандра Севера. Выявы традыцыйных рымскіх багінь прысутнічаюць на манетах, якія прысвечаны Юліі Мамеі — маці рымскага імператара Аляксандра Севера. На гэтых манетах вылучаюцца выявы багіні Венеры з легендамі Venus Felici, Venus Felix, багіні Юноны з легендай Iuno Conservatrix, а таксама выявы багінь Весты, Фартуны, Вікторыі (RIC IV. II. Severus Alexander № 340—342, 350—358, 360—364, 365) [12]. Сам імператар дэманстраваў прыхільнасць да традыцыйных рымскіх багінь, якія сімвалізавалі рымскія цноты — Набожнасць, Мужнасць, Надзея, Спакой, Поспех (RIC IV. II. Severus Alexander № 9, 13, 51, 77, 95, 137, 149, 167, 170, 181) [12]. Салярны бог Sol застаецца на манетах гэтага імператара, але захоўвае традыцыйнае рымскае аблічча (RIC IV. II. Severus Alexander № 8, 76, 102, 106, 109—119) [12].

Правінцыяльная чаканка ў Рымскай імперыі адлюстроўвае мясцовую рэлігійную сітуацыю і ўзаемадзеянне рэлігійнай палітыкі рымскага цэнтра і правінцыяльных эліт [16]. На шматлікіх манетах, якія паходзяць з усходніх правінцый Рымскай імперыі, можна заўважыць выявы мясцовых багоў і багоў грэка-рымскага пантэону. На чаканцы рымскай правінцыі Віфініі прысутнічаюць выявы багоў Дэметры, Пасейдона, Цюхе, Асклепія, Зеўса і Апалона. Гэтыя правінцыяльныя манеты сведчаць аб значнай папулярнасці грэчаскіх багоў у гэтым рэгіёне (RPC VI Severus Alexander № 3025, 3029, 3033, 3156, 3157, 3161, 3162) [16]. Выявы Серапіса і Ісіды больш характэрны для егіпецкай чаканкі (RPC VI Severus Alexander № 10401, 10508, 10617, 10646) [16]. Таксама на егіпецкіх манетах прысутнічаюць выявы Геліяса і Селены, але іканаграфія сонечнага бога Геліяса адпавядае традыцыйным выявам Sol Invictus на агульнаімперскіх манетах (RPC VI Severus Alexander № 10453, 10524, 10563) [16]. Але правінцыяльная чаканка амаль не разглядаецца ў аналізе рэлігійнай сітуацыі ў Рымскай імперыі даследчыкамі гісторыі антычнай рэлігіі.

Пазітыўная рэакцыя эліты, рымскага войска і насельніцтва на прыхільнасць Аляксандра Севера да традыцыйных багоў рымскага пантэону заўважна ў эпіграфічным матэрыяле. Надпіс з лагернага свяцілішча ў рымскай Германіі прысвечаны ў гонар Юпітэра, Марса, Вікторыі, імператара Аляксандра і яго маці Юліі Мамеі (CIL XIII, 8017) [17]. Згодна са сведчаннямі надпісу з верхняй Паноніі, Луцый Антоній Сабініян аднавіў разбураны храм Юпітэру, Юноне, Мінерве, Нептуну, Ліберу і іншым багам падчас кіравання імператара Аляксандра (CIL III, 11079) [17]. Жыхары панонскага Аквінка паставілі алтар у гонар Юпітэра Тэўтана, які з'яўляўся сінкрэтычным кельцка-рымскім богам, і Юноны за дабрабыт і здароўе імператара (CIL III, 10481) [17]. Салдаты II Дапаможнага легіёну, які размяшчаўся ў Паноніі, пасвяцілі надпіс у гонар Маці Зямлі (CIL III, 10469) [17]. Таксама сустракаюцца надпісы за здароўе і дабрабыт імператара ў гонар Кібелы (CIL VIII, 19981; CIL XIV, 4303), Дыяны (CIL III, 10304; CIL III, 13722), мясцовага бога Азіза (AE 1910, 142), Лібера і геніі мясцін (CIL XIII, 8205) [17]. У Сармізегетузе быў пастаўлены алтар Малакбелу, Яргіболу і пальмірскім багам (CIL III, 7955; AE 2011, 1084) [17]. Жыхары Рымскай імперыі імкнуліся падкрэсліць сваю лаяльнасць традыцыйнаму рымскаму пантэону, але адначасова шанавалі мясцовых багоў і багоў усходніх культаў. Гэта сведчыць пра суіснаванне рэлігійнага сінкрэтызму і традыцыяналізму ў духоўнай культуры Рымскай імперыі.

Такім чынам, звесткі нумізматыкі і эпіграфікі дэманструюць вернасць імператара рымскім рэлігійным традыцыям. Апошні прадстаўнік дынастыі Севераў не праяўляў публічную прыхільнасць да замежных культаў. Прычына гэтага заключаецца ў тым, што імператар

абапіраўся на падтрымку прадстаўнікоў рымскай палітычнай эліты, якія асуджалі рэлігійную палітыку папярэдняга імператара. Сведчанні рымскіх гісторыкаў дазваляюць заўважыць сінкрэтычную лінію ў палітыцы гэтага імператара. Аляксандр Север ставіў статуі абагаўлёных імператараў, а ў асабістым ларарыі імператара прысутнічалі статуі Апалонія Ціянскага, Арфея, Аўраама і Хрыста (SHA Alex. Sev. XXIX, 2) [9, с. 170]. Звычайна даследчыкі не давяраюць сведчанням са зборніка біяграфій рымскіх імператараў [4; 5, с. 257—290]. Гісторыя Аўгустаў разглядаецца як ненадзейная гістарычная крыніца па гісторыі рымскага грамадства II—III стагоддзяў н. э. [5, с. 273]. Польскі даследчык Р. Сускі лічыць, што праявы сінкрэтызму ў рэлігійнай палітыцы Аляксандра Севера мусілі быць заўважны на манетах гэтага імператара [5, с. 275]. Дадзены довад не звяртае ўвагу на сведчанне царкоўнага гісторыка Еўсевія Кесарыйскага аб прыхільнасці Аляксандра Севера і Юліі Мамеі да хрысціян (Euseb. Hist. Eccl. VI, 21. 3) [18, с. 386—387]. Імператар і яго сям’я магчыма былі знаёмы з прадстаўнікамі хрысціянскай інтэлектуальнай эліты Арыгенам і Юліем Афрыканам [3, с. 459—470; 19, с. 110—111]. Не ўлічваецца паходжанне сям’і рымскага імператара з Сірыі, якая з’яўлялася пляцоўкай міжкультурнага і рэлігійнага дыялогу на ўсходзе Рымскай імперыі. Культура рымскай Сірыі фармавалася і развівалася пад уплывам грэка-рымскай, парфянскай і яўрэйскай культур. У памежным горадзе Дура-Еўропас (Сірыя) прысутнічалі сакральныя помнікі мясцовага хрысціянства, арыгінальныя фрэскі з яўрэйскай сінагогі з выявамі біблейскіх сцэн, храм пальмірскіх багоў і мясцовы мітрэум — месца шанавання бога Мітры [20, с. 133—185; 21, с. 1—41]. Родзічы Аляксандра Севера жылі ў асяроддзі, якое было досыць адкрытым да міжкультурнага і рэлігійнага сінтэзу. Разам з гэтым сям’я рымскага імператара шанавала Апалонія Ціянскага. Юлія Домна, якая была родзічам Аляксандра Севера і жонкай рымскага імператара Септымія Севера, замовіла біяграфію Апалонія Ціянскага ў Флавія Філастрата (Philostr. VA. 1. 3) [22, с. 6]. Імператар Каракала, сын Юліі Домны і Септымія Севера, шанаваў гэтага язычніцкага філосафа (Dio Cass. LXXVII, 18. 4) [8, с. 300]. Італьянскі даследчык К. Мандэла лічыць, што сведчанне аб асабістым ларарыі Аляксандра Севера з’яўляецца праўдападобным, бо адпавядае агульнаму рэлігійнаму і культурнаму клімату пачатку III стагоддзя н. э. [23].

**Заключэнне.** Рэлігійная палітыка Аляксандра Севера заключалася ў падтрымцы рэлігійных традыцый рымскай рэлігіі і праяў рэлігійнага сінкрэтызму ў духоўнай культуры Рымскай імперыі. Падтрымка рымскіх традыцый была абумоўлена палітычным кампрамісам паміж сям’ёй імператара і рымскай палітычнай эліты, якая негатыўна адрэагавала на рэлігійную рэформу імператара Элагабала. Лінія на падтрымку праяў рэлігійнага сінкрэтызму ў палітыцы рымскага імператара Аляксандра Севера захоўваецца, але мадэль сінкрэтызму становіцца кансерватыўнай, бо абмяжоўваецца прыватным культам. Родзічы рымскага імператара ўлічвалі правал рэлігійнай палітыкі Элагабала, якая не адаптавала эмескі культ да рымскіх традыцый і не атрымала значнай падтрымкі з боку розных сацыяльных колаў насельніцтва імперыі. Сведчанні нумізматычнага матэрыялу яскрава дэманструюць рэстаўрацыйны характар рэлігійнай палітыкі Аляксандра Севера, які аднаўляў рымскую традыцыю і шанаваў вярхоўнага бога імперыі Юпітэра Капіталійскага. Эпіграфічныя дадзеныя дазваляюць судзіць аб падтрымцы рымскім імператарам культу традыцыйных рымскіх багоў, што не замінала шанаванню багоў лакальных і містэрыяльных культаў.

Аляксандр Север і яго сям’я не маглі адмовіцца ад падтрымкі рэлігійнага сінкрэтызму, бо яны паходзілі з рымскай Сірыі, у якой праходзіў сінтэз розных культур і рэлігійных вераванняў. Магчыма, імператар і яго родзічы былі знаёмыя з прадстаўнікамі хрысціянскай інтэлектуальнай эліты і праяўлялі цярпімасць і цікавасць да новай рэлігіі. Рэлігійная палітыка Аляксандра Севера заключалася ў кансерватыўным балансе паміж рымскім традыцыяналізмам і рэлігійным сінкрэтызмам у жыцці Рымскай імперыі. Дадзены баланс заключаецца ў дамінаванні рымскіх традыцый над праявамі рэлігійнага сінкрэтызму, які абмяжоўваўся прыватнымі і лакальнымі культамі.

**Спіс цытаваных крыніц**


1. *Штаерман, Е. М.* Кризис рабовладельческого строя в западных провинциях Римской империи / Е. М. Штаерман. — М. : Изд-во АН СССР, 1957. — 511 с.
2. *Зелинский, Ф. Ф.* История античных религий : в 5 т. / Ф. Ф. Зелинский. — СПб. : Квадриум, 2018. — Т. 5, кн. 2 : Религия Римской империи. — 560 с.
3. *Mazzarino, S.* L'impero Romano : in 2 v. / S. Mazzarino. — Bari : Laterza, 2007. — V. 2. — 534 p.
4. *Straub, J.* Le leggi di Severo Alessandro in materia di usura (AS 26,3) / J. Straub // Atti del Colloquio Patavino sulla Historia Augusta. — Roma : Universita degli studi do Padova, 1963. — P. 5—20.
5. *Suski, R.* Jowisz, Jahwe i Jezus. Religie w Historia Augusta / R. Suski. — Warszawa : Wydawnictwo Naukowe Sub Lupa, 2014. — 496 p.
6. *Pakkanen, P.* Interpreting Early Hellenistic Religion: A Study Based on the Mystery Cult of Demeter and the Cult of Isis / P. Pakkanen. — Helsinki : Finnish Institute at Athens, 1996. — 186 p.
7. *Шайд, Дж.* Религия римлян / Дж. Шайд ; пер. с франц. О. П. Смирновой. — М. : Новое изд-во, 2006. — 280 с.
8. Кассий Дион Коккейан. Римская история. Книги LXIV—LXXX / Кассий Дион Коккейан ; пер. с древнегреч. А. В. Махлаюка. — СПб. : Филфак СПбГУ, 2011. — 456 с.
9. Властелины Рима. Биография римских императоров от Адриана до Диоклетиана / пер с лат. С. П. Кондратьева. — СПб. : Алетейя, 2001. — 384 с.
10. Геродиан. История императорской власти после Марка : в 8 кн. / пер. с древнегреч. А. И. Доватура [и др.]. — СПб. : Алетейя, 1995. — 289 p.
11. *Shäfer, D.* Iuppiter als Schutzgott des Alexander Severus in der Reichsprägung / D. Shäfer // Geldgeschichtliche Nachrichten. — Mai 2019. — Jg. 54. Heft 303. — P. 132—138.
12. The Roman Imperial Coinage (RIC) : in 10 v. / ed. H Mattingly, E. A. Sydenham. — London : Spink&Son, 1936—1994. — Vol. IV, part 2. — P. 1938—240.
13. *Cohen, H.* Description Historique des Monnaies Frappées sous L'Empire Romain communémet appelées Médailles Impériales : in 8 vol. / H. Cohen. — Paris : M. Rollin, 1860. — Vol. 4. — 566 p.
14. *Rowan, C.* Becoming Jupiter: Severus Alexander, The Temple of Jupiter Ultor, and Jovian Iconography on Roman Imperial Coinage / C. Rowan // American Journal of Numismatics. — 2009. — Vol. 21. — P. 123—150.
15. *Halsberghe, G. H.* The cult of Sol Invictus / G. H. Halsberge. — Leiden : E. J. Brill, 1972. — 192 p.
16. Roman Provincial Coinage online (RPC) [Electronic resource]. — Mode of access: https://rpc.ashmus.ox.ac.uk/ . — Date of access: 28.05.2021.
17. Epigraphik-Datebank [Risorsa elettronico]. — Modalità d'acceso: http://www.manfredclauss.de/gb /index.html . — Data d'acceso: 01.05.2021.
18. *Кесарийский, Е.* Церковная история / Е. Кесарийский ; пер. с древнегреч., под ред. И. В. Кривушина. — СПб. : Изд-во Олега Абышко, 2014. — 544 с.
19. *Rinaldi, G.* Pagani e cristiani. La storia di un conflitto (secoli I—IV) / G. Rinaldi. — Roma : Carocci editore, 2016. — 488 p.
20. *Ростовцев, М. И.* Караванные города / М. И. Ростовцев. — СПб. : Нестор-История, 2010. — 218 с.
21. *Dirven, L.* The Palmyrenes of Dura-Europos: A Study of Religious Interaction in Roman Syria / L. Dirven. — Leiden : Brill, 1999.
22. *Филострат, Ф.* Жизнь Аполлония Тианского / Ф. Филострат ; пер. с древнегреч., под ред. М. Л. Гаспарова. — М. : Наука, 1985. — 330 с.
23. *Mondello, C.* Sui Lares di Severo Alessandro (HA Alex. Sev. 29, 2; 31, 4—5): fra conservazione e trasformazione / C. Mondello // Hormos. Ricercha di Storia Antica. — 2017. — № 9. — P. 189—229.


Паступіў у рэдакцыю 24.01.2022.